■ Ля-ля-фа

# Творчасць па-сяброўску

## Экс-саліст «СМЭШ» спеўся з беларускай

**Нядаўна ў Мінску адбылася прэзентацыя новай песні «Хачу» вядомага расійскага выканаўцы Улада Тапалава і беларускай спявачкі Настассі Новікавай, якая толькі пачынае свой шлях на эстрадзе. Напярэдадні прэм'еры Улад і Настасся сустрэліся з журналістамі, каб падзяліцца ўражаннямі ад працы, раскрыць імёны сваіх уласных куміраў і зарыентаваць тых, хто не супраць быў бы заваяваць сэрца артыстаў...**



Знаёмству маладой спявачкі Настассі Новікавай і Улада Тапалава паспрыяла клубны прамоўтар у сакавіку 2014-га , калі Тапалаў прыязджаў у Мінск з канцэртам. Як прызнаюцца самі выканаўцы, дастаткова было некалькіх хвілін размовы, каб зразумець, што ідэя з сумесным дуэтам будзе рэалізавана. Праз месяц Насця паехала ў Маскву, каб пачаць працу над новай песняй. Аўтарам кампазіцыі «Хачу» стаў Яўген Маскоў. Запісвалі яе ў студыі Maska Studio Sound Production.

***— Як вам працавалася разам?***

**У. Т.:** Мне прыемна бачыць, што Насця не проста (як многія ў яе ўзросце) хоча спяваць, але яшчэ і займаецца музыкай. Для мяне гэты крытэрый важны як у адборы людзей, з якімі я працую, так і наогул, калі размова заходзіць пра музыку. Мне здаецца, гэта важная рыса для чалавека, што імкнецца трапіць на сцэну. У нашым выпадку гэта быў вырашальны крытэрый у прыняцці рашэння аб супрацоўніцтве.

**А. Н.:** Мне было вельмі прыемна і лёгка працаваць з Уладам. Ён прысутнічаў на маім запісе ў студыі, даваў карысныя парады, настройваў на выкананне. І Улад вельмі адкрыты ў зносінах, таму ніякіх цяжкасцяў не ўзнікала.

***— Узнікалі думкі развіваць супрацоўніцтва: зняць кліп альбо запісаць яшчэ нешта?***

**У. Т.:** Асабліва не было калі пра гэта думаць. У Насці было паступленне, і маё лета працякае ў шчыльным гастрольным графіку, таму нават фізічна мы б не паспелі зняць кліп. І вольнага часу не так шмат, таму і не думалі пакуль ні пра што падобнае.

Зрэшты, агент спевака расказвае, што ў іх запланаваны сумесны тур па Беларусі на бягучую восень. Зусім хутка стануць дакладна вядомыя даты і гарады, а пакуль што ў планах наведаць Брэст, Магілёў і, магчыма, Наваполацк.

***— Ці першае гэта ваша супрацоўніцтва з беларускімі выканаўцамі, а можа і новыя кандыдаты ёсць на прыкмеце?***

**У. Т.:** Што тычыцца беларускіх артыстаў, гэта мой першы вопыт. Да такога кшталту супрацоўніцтва я стаўлюся як да творчасці. Тут не можа ісці размовы пра нейкі канвеер альбо бізнес. У нас з Настассяй проста склалася ўсё па-сяброўску.

Расказаў артыст і пра свае ўражанні ад беларускіх гарадоў.

**У. Т.:** Я быў у Брэсце, у Гомелі з канцэртамі. І, ведаеце, нават нягледзячы на тое, што мы блізкія суседзі, краіны і народы, але розніца адчуваецца, асабліва ў апошнія гады. Я буду банальным, калі скажу, што сталіца адрозніваецца ад абласных гарадоў, як і ў Расіі. Аднак мяне не перастаюць здзіўляць добразычлівасць людзей і адчуванне нейкага агульнага спакою.

***— Ці ўдалося ўжо недзе адпачыць гэтым летам?***

**У. Т.:** Я паспеў тыдзень пабыць у Сочы, мы там засталіся пасля канцэрта. Потым быў два тыдні ў Іспаніі і не так даўно вярнуўся з Італіі. Магчыма, у жніўні наведаю маці ў Францыі. Я прывык да пэўнага камфорту, да якога мяне прывучылі бацькі і які сам магу сабе дазволіць. Але адправіцца ў паход мне было б цікава. Перыядычна чую, як нехта з маіх сяброў, напрыклад, спускаўся на байдарках дзесяць дзён без тэлефона і іншых рэчаў, і я абсалютна не супраць акунуцца ў нешта такое, але пакуль не знайшлося магчымасці.

Не падумайце, я не «прынц на гарошыне», я абсалютна звычайны чалавек. Вырас у аднапакаёвай кватэры, ездзіў і цяпер часам езджу на метро. Ніякіх праблем у гэтым сэнсе.

***— Насця, а хто ваш кумір, акрамя Улада Тапалава?***

*(«Сяргей Лазараў», — апярэджвае адказ Насці Тапалаў.)*

**А. Н.:** Мне падабаецца Крысціна Агілера, музыка Майкла Джэксана, Адрыяна Чэлентана. Яшчэ Ані Лорак.

Таксама спявачка падзялілася, што толькі «за», калі яе паклічуць у нейкі праект альбо нешта прапануюць. Цяпер жа яна паступіла ў ВНУ і будзе працягваць далей вучыцца як піяністка (дарэчы, займаецца музыкай Насця з пяці гадоў). Таксама яна працуе над запісам альбома.

Не абмінулі ўвагай і тэму прыхільнікаў, каб даведацца, на каго звяртаюць увагу артысты і хто цікавіцца імі...

**А. Н.:** Для мяне знешнасць мужчыны другасная. Перш за ўсё ў мужчыну я шукаю суразмоўцу, у якім спалучаюцца розум, жаданне клапаціцца і пачуццё гумару. І важна, каб мы адно аднаго разумелі. Паклоннікаў хапае: чую кампліменты, запрашаюць на каву. Бачу рэакцыю людзей, калі еду ў транспарце альбо іду па вуліцы.

**У. Т.:** Ведаеце, з часам замест мімалётнага і эфектнага пачынаеш шукаць і жадаць нешта больш спакойнае, каб яно было сапраўдным і доўгатэрміновым. Я не кажу, быццам галоўнае — душа, бо знешнасць таксама вельмі важная. Дзяўчына павінна быць прыгожай. Аднак часта бывае, што знешнасць не мае духоўнага напаўнення. Таму проста прыгожая фігура мяне сёння ўжо не спакушае. Мне хапіла ў жыцці і эфектнасці, і эмоцый, але яны, як правіла, хутка заканчваюцца. І становіцца нецікава...

**Алена ДРАПКО**

■ Галасы братэрства

# УЗМІНЬ — ЗНАЧЫЦЬ ХУТКАСЦЬ

**Сённяшнія падзеі, якія адбываюцца ва Украіне, напружваюць сітуацыю ў розных галінах і сферах жыцця народа гэтай краіны. Відаць, зусім не да творчасці і многім пісьменнікам. У відавочнай разгубленасці розныя плыні інтэлігенцыі. Прыйдзе час — і, магчыма, самымі рознымі пададуцца ацэнкі таго, што адбываецца зараз у вялікай і багатай на культуру і літаратуру краіне. А тое, што ўкраінская літаратура сапраўды дастаткова развітая і багатая, сведчаць і сённяшнія памкненні беларускіх перакладчыкаў. Дзякуючы ім ў восьмым нумары часопіса «Полымя» ў раздзеле «Галасы свету» з'явілася падборка «Сучасныя ўкраінскія апавяданні».**



Галіна ТАРАСЮК.

Кароткае знаёмства з літаратурным працэсам ва Украіне робіць малады крытык Юлія Алейчанка, прадстаўляючы чытачам «Полымя» апавяданні Анатоля Дзімарава, Галіны Тарасюк, Васіля Парцяна, Уладзіміра Даніленкі, Міхайлы Слабашпіцкага: «... складана перакладаемы ўкраінскі архаізм «узьмінь», які абазначае хуткасць, зменлівасць воднай плыні, напэўна, найлепшым чынам характарызуе стан сучаснай украінскай літаратуры. Прычым шакіруюць і правакуюць публіку як маладыя, так і старэйшыя. Напрыклад, у 2010 годзе прыцягнула ўвагу грамадскасці класік Ліна Кастэнка раманам «Запіскі ўкраінскага вар'ята», напісанага ад асобы 35-гадовага праграміста. Не так даўно шырокі рэзананс меў і раман «Чорны груган» Васіля Шкляра, які адны крытыкі прылічылі да найбольш яркіх і цікавых падзей літаратурнага жыцця, а іншыя — да безгустоўнай палітычнай прапаганды. А чаго толькі вартая, напрыклад, адмова Юрыя Андруховіча ад Нацыянальнай прэміі Украіны імя Т. Шаўчэнкі ці падпісанне ўласнай крывёй кантракта з выдавецтвам «Фоліа» Ладай Лузінай?..» І згаданыя творы, і апавяданні, надрукаваныя ў «Полымі», яшчэ павінны вытрымаць выпрабаванне часам. І ўсё ж публікацыя ўкраінскіх апавяданняў сведчыць пра тое, што за парадными справаздачамі пра ўкраінска-беларускія літаратурныя стасункі праглядаецца сучасны літаратурны працэс ва Украіне. Гэта, пэўна, і будзе цікава звычайнаму чытачу, а не толькі літаратуразнаўцам.

Перакладчыкамі ўкраінскіх апавяданняў выступаюць Юлія Алейчанка, Вікторыя Шымко, Наталля Луновіч, Людміла Рублеўская. Пра планы прадстаўлення ўкраінскай літаратуры ў Беларусі мы пацікавіліся ў намесніка дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» — галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Алеся Бадака. Вось што ён адказаў: «Летась мы выпусцілі кнігу ўкраінскай і беларускай літаратуры пад серыйнай назвай «Сугучча сэрцаў: Беларусь — Украіна». Зборнік, у якім ці не самай прадстаўнічай была падборка вершаў Барыса Алейніка, быў прэзентаваны ў Кіеве ў Нацыянальным саюзе пісьменнікаў Украіны. Цяпер на падыходзе да выдання кніга сучаснага ўкраінскага апавядання, зборнік «Казкі» Міхайлы Слабашпіцкага. Нядаўна ў нашым выдавецкім доме пабачыла свет кніга ўкраінскай паэзіі ў перакладах Ніны Мацяш... Шмат што з перакладаў падрыхтавана да друку ў літаратурна-мастацкай перыёдыцы...»

**Максім ЛАДЫМЕРАЎ**

# Сацыялізм: вяртанне ў заўтра?

## У МАСКВЕ РЫХТУЕЦЦА ДА ВЫХАДУ Ў СВЕТ НОВЫ НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫ ЧАСОПІС. НАЗВА ЯГО ГАВОРЫЦЬ ПРА МНОГАЕ

Адзін з буйнейшых выдавецкіх дамоў Расіі — "Панарама" — прыняў рашэнне аб выпуску перыядычнага выдання з назвай "Строительство социализма в СССР: история и современность". Пакуль вядома, што галоўным рэдактарам часопіса будзе Кацярына Шпікалава. Выходзіць ён будзе адзін раз у два месяцы. Агульны памер — 64 паласы. Зразумела, багата ілюстраваны. Мяркуецца, што гэты часопіс будзе адрасаваны палітолагам, палітыкам, сацыёлагам, студэнтам і аспірантам і проста нераўнадушным да гісторыі СССР, Расіі, постсавецкіх дзяржаў людзям. Тэматыка выдання ахопіць самы шырокі спектр палітычнага, культурнага, эканамічнага, сацыяльнага жыцця. У новым медыйным праекце выступяць вядомыя дзеячы савецкай эпохі, выдатныя вучоныя і публіцысты. Асноўная задача, як лічаць заснавальнікі, — паказаць шматаблічную гісторыю Савецкага Саюза ад моманту стварэння і да пачатку 1990-х гадоў. Пры гэтым акцэнт будзе зроблены на тым лепшым, што створана за дзесяцігоддзі існавання СССР.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Калейдаскоп

# ПРЫГОЖА ЕДУЦЬ!..

## У Мінску выбралі самую стыльную веласіпедыстку



**9 жніўня ў сталіцы ў рамках гарадскога руху «I bike Minsk» упершыню вызначылі «каралеву колаў і руля». У адборачным туры конкурсу «Велалэдзі-2014» узялі ўдзел больш як 100 дзяўчат, якія папярэдне размясцілі свае фота з веласіпедамі ў розных сацыяльных сетках. 20 аўтараў і выканаўцаў самых арыгінальных вобразаў і стыльна афармленых ровараў, паводле рашэння журы, выйшлі ў фінальны этап, які адбыўся ў мінскім парку Перамогі.**

Па чырвонай дывановай дарожцы пад апладысменты гледачоў і шчоўканне затвораў шматлікіх фотакамер праехаліся ў адмысловым «веласіпедным дэфіле» як дарослыя эфектныя пані, так і зусім маленькія гарэзлівыя ўдзельніцы. А суддзі, у лік якіх увайшлі вядомы стыліст Аляксандр Кірынюк, кіраўнік аргкамітэта Беларускага тыдня моды Яніна Ганчарова, стыліст і дызайнер Іван Мікуловіч, ацэньвалі як натуральнасць і гарманічнасць, так і смеласць і яркасць прадстаўленых вобразаў.

«У свой юбілей мы паставілі мэту — перасадзіць гэтым летам як мага больш мінчан на веласіпеды, — расказаў адзін з арганізатараў мерапрыемства, **кіраўнік аддзела маркетынгу і продажу кампаніі А-100 Дэвелопмент Ігар КОЛЬЧАНКА**. — Дзеля гэтага амаль усё лета працуюць некалькі пунктаў бясплатнага велапракату. Але дзяўчаты карыстаюцца веласіпедамі менш актыўна, бо існуе шэраг стэрэатыпаў наконт нязручнасці і «нежаноцкасці» гэтага віду транспарту. Каб разбурыць міфы і паказаць, што дзяўчына і веласіпед могуць быць не проста сумяшчальныя, а вельмі стыльныя і прывабныя, мы і праводзілі конкурс «Велалэдзі». Водгук атрымалі такі вялікі, што налета, відаць, давядзецца шукаць значна большую пляцоўку, каб змясціць усіх веласіпедыстак і іх групы падтрымкі».



Перамогу ў конкурсе святкавала ў выніку мінскі фатограф Кацярына Дзмітрыева. Сваю ўзнагароду — сучасны і камфортны гарадскі веласіпед — дзяўчына, дарэчы, вырашыла падарыць сяброўцы, каб катацца па Мінску разам.

Спецыяльныя тытулы і прызы атрымалі пераможцы ў намінацыях «Самы арыгінальны вобраз» — дызайнер Лана Курлянд, ураджэнка Рыгі, і «Самы стыльны веласіпед» — Ганна Мустафаева. Сярод канкурсантак былі разыграны таксама прыз глядацкіх сімпатый «Народная велалэдзі» і тытул «Міні-велалэдзі».

**Вікторыя ЗАХАРАВА**

НАРОДЖАНЫЯ 11 жніўня

**Гэтыя людзі валодаюць магутным імкненнем да пазнання праўды, яны адчуваюць, што іх задача — адкрыць утоенае. Яны добра разумеюць чалавечую натуру, грошы ўкладваюць з розумам і не робяць сакрэтаў з дасягнення імі фінансавага поспеху. Яны лічаць за лепшае ўтойваць сваё эмацыянальнае жыццё таму, што не прызвычаіліся давяраць усім без разбору. Ім празмерна важна мець аўдыторыю для выказвання сваіх поглядаў. Яны шукаюць павагі, але жывуць толькі для таго, каб іх усхвалялі іншыя. Выкарыстоўваючы інтуіцыю, могуць дасягнуць вялікіх поспехаў. У сям'і яны не павінны быць у цэнтры непрыемнасцяў, а мудрасць, якая прыходзіць з узростам, павінна ўтаймаваць бунтарскі бок іх характару.**

НАРОДЖАНЫЯ 12 жніўня

**Яны строга прытрымліваюцца традыцый, але не сляпа, а засяроджаны на тым, каб як мага больш узяць для сябе з вопыту папярэдніх пакаленняў; адчуваюць імкненне да новай інфармацыі, невядомай шырокаму колу асоб. Іх паводзіны і стыль жыцця шмат у чым вызначаюцца пошукам агульных кропак суіснавання розных эпох. Іх жыццёвы шлях часта бывае галавакружным. Навакольныя глядзяць на іх як на тыранаў або снобаў. Калі яны зменшаць свае тыранічныя тэндэнцыі, яны знойдуць верных і надзейных сяброў. Ім неабходна навучыцца падзяляць чужыя погляды, не забывацца расслабляцца, смяяцца і забаўляцца.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1399** год — 615 гадоў таму адбылася бітва на рацэ Ворскла (левы прыток Дняпра). Войскі Вялікага Княства Літоўскага на чале з вялікім князем Вітаўтам былі акружаны і разбіты конніцай Залатой Арды. Тысячы воінаў загінулі або трапілі ў палон. Сам Вітаўт з астаткамі войска збег. Гэтае паражэнне стала адной з прычын падпісання ў 1401 годзе Віленска-Радамскай уніі ВКЛ з Польшчай.

**1851** год — амерыканец Ісак Мэрыт Зінгер атрымаў патэнт на швейную машынку. Дзякуючы гэтаму механізму хатнія гаспадыні змаглі справіцца з шыццём вопраткі без цэлай брыгады механікаў. Ісак Зінгер нарадзіўся ў мястэчку Трой у 1811 годзе. У 12 гадоў ён пачаў працаваць вучнем механіка, і гэта ў яго нядрэнна атрымлівалася, але тут хлопец захапіўся тэатрам і далучыўся да адной з гастралюючых труп. Да 20 гадоў, астыўшы да вандроўнага жыцця, Зінгер уладкаваўся працаваць на завод. Вытворчасць яго не натхняла, і менавіта з-за гультайства малады чалавек вынайшаў — вось тут яму не адмовіш у прадпрымальнасці — станок для разьбы па дрэве, што прынесла добры даход. Затым Зінгер адправіўся ў Нью-Ёрк, дзе зноў жа, па ўласным прызнанні, «ад таго, што не было чаго рабіць», пачаў вывучаць швейныя машыны. Яны тады шылі вельмі дрэнна, ніткі ўвесь час блыталіся і рваліся. Да таго ж тыя машыны былі вельмі дарагімі і грувасткімі. Зінгер распрацаваў свой варыянт усяго за дзесяць дзён. Яго іголка хадзіла не па крузе, а зверху ўніз, што было беспрэцэдэнтным... 




рапынным, машынка ўстанаўлівалася на стале, каб можна было зручна размясціць тканіну. Ну і вядома, галоўнае адрозненне вынаходкі Зінгера ад іншых швейных машын, — педаль, якая вызваліла рукі майстрых. Першы экзэмпляр быў прададзены за 100 долараў. Канструкцыя была вельмі простай, але эфектыўнай. Неўзабаве гэта зразумелі вытворцы гатовага адзення, і Зінгер, які імгненна арганізаваў фірму, пачаў нарошчваць абароты і прадаваць сотні тысяч машын у год. Дапамагала і рэклама. Дарэчы, менавіта кампанія Зінгера стала першай, якая патраціла на рэкламу больш за 1 мільён долараў у год. У 1865 годзе, калі Зінгеру споўнілася 54 гады, ён вырашыў адысці ад спраў, пайшоў на пенсію. У яго да таго часу былі тры жонкі, чатыры палюбоўніцы і дваццаць два дзіцяці. Апошняя ўдава Зінгера Ізабель стала правобразам знакамітай статуі Свабоды ў Нью-Ёрку. А гмах фірмы Зінгер, збудаваны яго нашчадкамі, быў першым у Нью-Ёрку і доўгі час заставаўся самым высокім будынкам у свеце.

**1939** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (горад Ветка) Валерый Іванавіч Пракошын, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук (1989), прафесар (1990). У 1961 годзе скончыў БДУ, працаваў у ім. З 1974-га — у аддзеле навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ, з 1990-га — рэктар Рэспубліканскага міжгаліновага інстытута павышэння кваліфікацыі, затым начальнік упраўлення Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь, з 2000 года — намеснік дырэктара Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў. Аўтар шматлікіх навуковых прац.

Было сказана

**Карлас КАСТАНЕДА, амерыканскі пісьменнік:**

*«Чалавек становіцца мужным, калі яму няма чаго губляць. Мы маладушныя толькі тады, калі ёсць яшчэ штосьці, за што мы можам чапляцца».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 5.42 | 20.46 | 15.04 |
| Віцебск | — 5.27 | 20.40 | 15.13 |
| Магілёў | — 5.32 | 20.36 | 15.04 |
| Гомель | — 5.34 | 20.28 | 14.54 |
| Гродна | — 5.58 | 21.00 | 15.02 |
| Брэст | — 5.59 | 21.02 | 15.03 |

**Месяц**

*Поўня 10 жніўня.*
*Месяц у сузор'і Рыбы.*

**Імяніны**

***Пр.** Анатоля, Валянціна, Івана, Максіма.*
***К.** Клары, Алега, Інакенція, Леха, Юльяна.*



Фота БЕЛТА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Сёння з жонкай прыехалі забіраць дзяцей з дачы.**
**Першым да нас насустрач выбег шчаслівы, радасны дзядуля.**

Мужык сядзіць у бары і п'е. Другі ў яго пытаецца:
— Ты навошта п'еш?
— Каб быць прыгожым.
— Алкаголь цябе робіць прыгожым?
— Вядома! Калі я прыходжу дадому з бара, жонка мне ўвесь час кажа: «О! Прыйшоў, прыгажунчык!»

**Цікавае назіранне: 90% лянівых мужчын лічаць, што ім пасуе барада.**

Я спытаў у жонкі, ці патрэбна мне палюбоўніца. Яе адказ здаўся мне непераканаўчым.




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 19.878. Індэкс 63850. Зак. № 3348.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 жніўня 2014 года.